# У ГАСЦЯХ – ПІСЬМЕННІЦА!

**Працягваюцца творчыя сустрэчы членаў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ва ўстановах адукацыі. У чарговы раз месцам для правядзення такога мерапрыемства стала Гродзенская гарадская гімназія імя А. І. Дубко. 5 сакавіка тут перад вучнямі другіх класаў выступіла наша лідар, старшыня ГрАА СПБ, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч.**



Як аўтарытэтны літаратар і работнік адукацыі з амаль паўвекавым стажам Людміла Антонаўна добра разумее важнасць дыялогу пакаленняў, які праходзіць на мове мастацтва. Фантазія аўтара і створаныя ёй сюжэты адкрываюць дзецям разнастайнасць жыцця, дапамагаюць спасцігаць сутнасць многіх важных рэчаў, арыентавацца ў неадназначных сітуацыях. Простая, дасціпная мова, яркія метафары, эфектна закручаныя інтрыгі, выкарыстаныя ў сюжэтах зразумелыя жыццёвыя абставіны – вось з чаго звычайна складаецца поспех творцы ў амплуа дзіцячага пісьменніка. Але ўсё не абмяжоўваецца толькі мастацкімі сродкамі. Найбагацейшы педагагічны вопыт Людмілы Антонаўны Кебіч, а таксама яе вопыт маці і бабулі спрыяюць удзелу ў гэтым літаратурным дыялогу пакаленняў універсальных элементаў дыдактыкі, адукацыйнага і выхаваўчага фактараў літаратуры. Невыпадкова Карней Іванавіч Чукоўскі казаў: «Для дзяцей трэба пісаць гэтак жа, як для дарослых, толькі лепш». Гарманічнае спалучэнне гульнявых элементаў са сродкамі навучання і складае новы ўзровень якасці літаратуры для самых маленькіх, перакананая беларуская пісьменніца з Гродна.

У ходзе сустрэчы ў галоўнай гродзенскай гімназіі пісьменніца прадставіла свае выдадзеныя ў Выдавецкім доме «Звязда» кнігі для самай малодшай чытацкай аўдыторыі: «Бэрак, Бэрак, дай цукерак!»; «Дзе схавана шакаладка?» і «Чароўны куфэрак часу». Асаблівасць творчасці Людмілы Кебіч, адрасаванай дзецям, яе ўнікальны стыль – у адпаведнасці часу, звыклым рэаліям, сувязь мінулага з будучыняй праз сучаснасць. Таму і мастацка адаптаваныя фальклорныя паданні, і традыцыйныя казкі, і загадкі гучаць у творах гэтага аўтара актуальна і свежа.

Хлопчыкі і дзяўчынкі сустрэлі госцю, вядомую беларускую пісьменніцу з увагай, а прачытаныя ёю творы на роднай беларускай мове ўспрынялі са шчырай зацікаўленасцю. Каб палегчыць задачу малышам, Людміла Антонаўна старалася растлумачыць значэнні некаторых слоў і выразаў, адказвала на пытанні, а на развітанне падпісала маленькім чытачам некалькі асобнікаў сваіх кніг.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса Людміла Антонаўна Кебіч у гасцях у вучняў малодшых класаў Дзяржаўнай установы адукацыі «Гродзенская гарадская гімназія імя А. І. Дубко». 5 сакавіка 2025 года.










**www.pisateli.by**